# Рашэнні з'езда—у жыццё

Новыя задачы, задачы карэннага пераломy ў практычнай дзейнасці, яе інтэнсіфікацыі і паглыблення, паставіў перад партыяй і савецкім народам XXVII з'езд КПСС. Навука названа галоўным фактарам, які вызначае паскарэнне нашага развіцця. Перад вышэйшай школай паўсталі новыя дадатковыя задачы, звязаныя, з аднаго боку, з рэформай сярэдняй школы, а з другога боку, з надзённымі патрэбамі аптымізацыі навучання студэнцтва. Аб'яднанне навуковых і вучэбна-выхаваўчых задач, якія стаяць перад ВНУ, вызначае ход роздуму прафесароў і выкладчыкаў універсітэта над тым, як канкрэтна ўвасабляць у жыццё рашэнні XXVII з'езда. «Веснік» змяшчае ў гэтым нумары водгукі некаторых вядучых прафесараў БДУ імя У. І. Леніна на рашэнні XXVII з'езда КПСС.

**А. А. ЛОЙКА — доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры**

Агульная самая высокая ацэнка нашай літаратуры выразна прагучала ўжо ў тым месцы Палітычнага даклада Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, з якім выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў, дзе сцвярджалася, што «маральнае здароўе грамадства, духоўны клімат, у якім жывуць людзі, у немалай ступені вызначаюцца станамі **літаратуры і мастацтва**». Ды ўслед за гэтым была наперш дадзена канкрэтная ацэнка зробленага ўжо літаратурай і мастацтвам, а затым былі выказаны самыя зацікаўленыя, у сутнасці сваёй крытычныя, як і канструктыўныя думкі і развагі. «Наша літаратура,—гаворачы аб яе здабытках дня ўчарашняга, сцвярджаў М. С. Гарбачоў,—адлюстроўваючы нараджэнне новага свету, разам з тым актыўна ўдзельнічала ў яго станаўленні, фарміруючы чалавека гэтага свету—патрыёта сваёй Радзімы, сапраўднага інтэрнацыяналіста. Тым самым яна правільна выбрала сваё месца, сваю ролю ў агульнанароднай справе». Што ж датычыць таго, чаго рэальна час зараз патрабуе ад дзеячоў пяра, пэндзля, разца, выразна і канкрэтна было сказана ўслед за прамым асуджэннем адмоўных праяў. «Ні партыя, ні народ,—гаварыў у гэтай сувязі М. С. Гарбачоў,— не маюць патрэбы ў парадным многапісанні і дробязным бытакапальніцтве, у кан'юнктуршчыне і дзяляцтве. Грамадства чакае ад пісьменніка мастацкіх адкрыццяў, праўды жыцця, якая заўсёды была сутнасцю сапраўднага мастацтва». Праўда мастацкага адкрыцця як першая задача мастакоў дэкляруецца ў Палітычным дакладзе ў агульным кантэксце пафаснага сцвярджэння праўды ва ўсіх сферах дзеяння партыі і грамадства.

Мы разумеем, што «праўда—не абстрактнае паняцце, яна канкрэтная. Яна—у здзяйсненнях народа і супярэчнасцях развіцця грамадства, у гераізме і штодзённасці працоўных будняў, у перамогах і няўдачах,—гэта значыць у самім жыцці, ва ўсёй яго шматграннасці, драматызме і велічы».

Ды не адны толькі тыя мясціны ў дакладзе М. С. Гарбачова, дзе непасрэдна гаварылася пра літаратуру і мастацтва, маюць да іх непасрэдныя адносіны. Агульнаму іх узняццю спрыяе і будзе спрыяць наогул увесь дух XXVII з'езда КПСС, увесь аналіз на ім літаральна ўсіх праблем і

праяў сучаснага жыцця нашай краіны, яе месца і ролі ў свеце і ўжо і ў сусвеце, у цывілізацыі, аналіз — сацыяльны, палітычны, агульнакультурны — сённяшняга свету ўвогуле. Усе аспекты гэтага вялізнага ўплыву ідэй і духу XXVII з'езда КПСС сёння ахапіць проста немагчыма, і яны ўсё больш і больш будуць выяўляць сябе ў часе, менавіта ў рэальным сваім ажыццяўленні, пераўтварэнні ў яву. І, само сабой зразумела, што дух і ідэі XXVII з'езда КПСС паўплывалі і будуць уплываць з часам усё ў большай ступені не толькі на самыя літаратуру і мастацтва, але і на вывучэнне іх, на выкладанне іх як у ВНУ, так і ў школе. І тут хочацца засяродзіцца на адным з момантаў, які здаецца вельмі перспектыўным у сваёй датычнасці як да вывучэння гісторыі літаратуры, так і да выкладання яе ў ВНУ і школе, а звязаны менавіта з тым узбуйненым ракурсам, у якім у Палітычным дакладзе, асабліва ў яго канцоўцы, бачацца сусвет, чалавек, гісторыя. Тут, у прыватнасці, гаварылася, што «нястрымны паток гісторыі ўжо накіраваўся да перакату паміж другім і трэцім тысячагоддзем», гаварылася аб Сусвеце і такім яго ўнікальным жыхары, як Чалавек. Прычым, словы «сусвет», «чалавек» у тэксце даклада дадзены менавіта з вялікай літары, як і вобраз п е р а к а т у патоку гісторыі прымушае нас бачыць гэты перакат шырока, маштабна, буйным планам. Вось менавіта гэтае ўзбуйненне плана, бачанне гісторыі на яе перакатах не можа не наштурхваць гісторыка літаратуры ці мастацтва не бачыць іх гісторыі менавіта п е р а к а т а м і эпох: Антычнасць, Сярэдневякоўе, Адраджэнне, Рэфармацыя, Барока, Асветніцтва, Новы Час. Такое менавіта бачанне гісторыі літаратуры і мастацтва больш рэальна дае адчуць перспектыву гістарычнага руху чалавецтва, цывілізацыі, робіць гэтую перспектыву выразна відочнай воку, унутранаму зроку, даючы магчымасць разам з тым кожны з гэтых гістарычных перакатаў эпох увідочніць і панарамна, мадэліраваць панараму тае ці іншае эпохі, бачыць у кожнай з іх Чалавека з вялікай літары і якім ён быў у кожнай з эпох у сваёй вялікасці, у сваім мастацкім адкрыцці праўды гісторыі, у стылі, непаўторнасці таго свайго адкрыцця. Пры гэтым, вядома ж, узбуйненым планам убачыцца і Зло — сацыяльнае, палітычнае, цемрашальскае, што супрацьстаяла чалавеку, і яшчэ большую нянавісць зродзіць да сябе, чым да гэтага ў нашых душах зраджала.

Іншы момант, які з тых жа першапрычын вынікае, — гэта патрэба рашучага адмаўлення ў практыцы ВНУ ад лекцый па літаратуры апісальных, статычных, аглядна-аморфных. Во патрабаванне буйнага плану ў выкладанні літаратуры няўмольна патрабуе лекцыі тэматычна-праблемнай, сінтэтычнаканцэнтраванай на вузлах праблем, сцяжэння ў адзін вузел усяго вобразна-тэматычнага матэрыялу, што з той ці іншай праблемай звязан, асацыіруецца. І ў дадзеным выпадку не заўсёды спрыяльным аказваецца прынцып строгай храналогіі, бо калі, напрыклад, па старабеларускай літаратуры вылучаць як тэматычна-праблемныя лекцыі па летапісанню, сярэдневяковай паэзіі, драматургіі, то яны патрабуюць озірку: першая — ад Нестара да Хранографаў і Сінопсісаў, а гэта значыць, ад XI да XVIII стагоддзя, другая — ад Скарыны да лірыкі Барока і Асветніцтва, а гэта значыць, ад пачатку XVI да XVIII стагоддзя. Ды выйгрыш пры гэтым ёсць той, што перад студэнтам узнікае рэальны рух у гісторыі літаратуры таго ці іншага жанра, жывая, так сказаць, эвалюцыя яго.

Патрабаванне тэматычна-праблемнай лекцыі ніяк не адмаўляе, аднак, лекцыі праблемна-манаграфічнай — па творчай індывідуальнасці таго ці іншага аўтара, па тым ці іншым творы. Не адмаўляе яно таксама лекцыі проста агляднай — з простай сістэматызацыяй, класіфікацыяй. Справа тут увогуле звязана са сцвярджэннем таго, што час зараз, сам дух і ідэі XXVII з'езда КПСС па-асабліваму ўвыпукляюць патрэбнасць і вартасць менавіта лекцыі тэматычна-праблемнае.

У гэтай жа сувязі думаецца таксама, што чытанне на філалагічным факультэце асобна курсаў гісторыі літаратуры, асобна — «чыстай» гісторыі — справа некалькі анахранічная, асабліва ў той час, калі ўжо маецца практыка чытання курсу па краіназнаўству — для студэнтаў з ПНР, напрыклад. Увядзенне падобнага курсу ў вучэбны план студэнтаў-філолагаў было б вельмі дарэчы, бо падобны курс прадугледжвае тэматычна-праблемны ахоп усяго сучаснага і гістарычнага жыцця рэспублікі, сінтэтычнага ўняцця матэрыялаў літаратуры, гісторыі, культуры, эканомікі і таго, што называецца фаунай і флорай. Думаць, што студэнт, жывучы ў Беларусі, нарадзіўшыся ў ёй, ужо цераз само гэта ведае свой край, больш чым наіўна. Увядзенне на філалагічным факультэце курса па краіназнаў-

ству толькі б спрыяла падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, поўна спазнаўшых і сучаснасць свайго краю і яго гісторыю. Не забудзем, што і школьная рэформа таксама завострана патрабуе ад сённяшняга настаўніка-філолага якраз таго, што непасрэдна дасць яму ўвядзенне ў вучэбны план курсу па краіназнаўству.

І ўвогуле пошук новых форм, спосабаў і метадаў вывучэння і выкладання літаратуры, як і іншых прадметаў у ВНУ і школе — надзённая, найважнейшая задача, на творчае вырашэнне якой не могуць не натхняць рашэнні XXVII з'езда КПСС.

## П. П. ШУБА — доктор филологических наук, профессор, заведующий кафедрой русского языка

В Политическом докладе, в новой редакции Программы КПСС подчеркивается необходимость повышения потенциала вузовской науки. Поэтому одной из первостепенных наших задач является коренное улучшение организации всей научно-исследовательской работы.

Филологи знают, как неудовлетворительно организовано в системе высшей школы внедрение результатов научных исследований, т. е. издание трудов и монографий, а это тормозит подготовку кадров высшей квалификации, развитие науки и культуры.

Представителям вузовской гуманитарной науки необходимо стремиться к тому, чтобы теоретические исследования имели реальный выход в практику — в практику высшего образования, народного просвещения, в дело повышения общей культуры населения, в частности — повышения культуры русской речи в Белоруссии.

Функционирование русской речи в условиях белорусско-русского двуязычия неизбежно порождает разнообразную интерференцию на всех языковых уровнях. Анализ проявлений такой интерференции и ее предупреждение в русской устной и письменной речи белорусов — одна из важнейших наших задач. Все обучение лингвистическим дисциплинам в вузах Белоруссии должно быть подчинено решению этой задачи. Мы постоянно констатируем постарение кадров преподавателей. Поэтому важно всемерно поддерживать выдвижение талантливой молодежи, подготовку кадров через аспирантуру, подготовку докторов наук. С этой целью кафедры и специализированные советы должны более внимательно анализировать тематику кандидатских и докторских диссертаций, нацеливать соискателей на решение актуальных задач, стоящих перед филологической наукой в настоящее время.

Республиканскому межвузовскому методическому объединению преподавателей русского языка и литературы необходимо координировать не только работу с аспирантами, но и рост кадров высшей квалификации.

Партийные документы обязывают обеспечить всеобщую компьютерную грамотность — начиная со школы. Естественно, что преподавательским кадрам также нужно овладеть компьютерной грамотностью.

Профилирующие кафедры филологического факультета Белорусского государственного университета имени В. И. Ленина выступили с обращением ко всем кафедрам активнее оказывать помощь средней общеобразовательной школе в реализации реформы. Необходимо искать такие формы помощи, которые давали бы наибольший эффект. Одной из таких форм является создание комплексов учебников и учебных пособий для средней школы. Кафедра русского языка активно включилась в эту работу. Авторские коллективы кафедры подготовили и издали учебник «Русский язык» для 5 — 6 классов школ с белорусским языком обучения, методическое пособие для учителя по этому учебнику, дидактический материал для учащихся. Такой же комплекс пособий готовится для 7 — 8 классов. Для учащихся средних школ Белоруссии подготовлены и изданы разнообразные словари (толковые, фразеологические, орфографические, паралексические и др.). Важную роль играет и повышение квалификации учительских кадров. В этом деле помощь вузовских кафедр неоценима.

Съезд подчеркнул важность овладения русским языком во всех союзных республиках. Лингвистов БГУ это обязывает интенсифицировать развитие исследований по русистике, улучшать издания по русскому языкознанию, в первую очередь — межведомственный научный сборник «Русский язык».